М. С. Дрозд

# БССР ЯК СПРОБА СТВАРЭННЯ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНСЦІ НА СЫЦАЯЛІСТЫЧНАЙ АСНОВЕ

*Разглядаюцца цікавыя падзеі, якія папярэднічалі ўтварэнню БССР.*

Непасрэдны ўплыў на ўтварэнне беларускай дзяржавы аказалі беларускія секцыі РКП(б). Пераважная іх большасць лічыла, што Беларусь павінна стаць Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікай і быць у цеснай федэратыўнай сувязі з РСФСР. Аднак, некаторыя супрацоўнікі Паўночна-Заходняга камітэта РКП(б) выказваліся за наданне ёй толькі аўтаноміі ў складзе РСФСР, у т.л. яго кіраўнік А. Мяснікян (Мяснікоў). Практычную работу па падрыхтоўцы да абвяшчэння БССР вялі Народны камісарыят па справах нацыянальнасцей РСФСР на чале з І. Сталіным і Паўночна-Заходні абласны камітэт РКП (б) з удзелам створанага пры Наркамнацы Беларускага нацыянальнага камісарыята. 23 снежня 1918 г. у Маскве праходзіла пасяджэнне камісіі Усерасійскага цэнтральнага выканаўчага камітэта, на якой адбылося юрыдычнае афармленне Заходняй вобласці як адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі РСФСР. Аднак 24 снежня 1918 г. ЦК РКП(б) прыняў рашэнне аб утварэнні Беларускай ССР. 25 снежня 1918 г. у Наркамнацы РСФСР адбылася нарада І. Сталіна з адказнымі работнікамі Белнацкаму, членамі Цэнтральнага бюро (ЦБ) беларускіх секцый РКП(б) і Камітэта Маскоўскай беларускай секцыі РКП(б). На ёй абмяркоўвалася пытанне аб практычным здзяйсненні рашэння ЦК РКП(б) і аб будучым Часовым рабоча-сялянскім урадзе БССР. 27 снежня ў Наркамнацы РСФСР з удзелам кіруючых партыйных і савецкіх работнікаў Заходняй вобласці, Белнацкама, ЦБ беларускіх секцый, Камітэта Маскоўскай беларускай секцыі РКП(б) абмеркавалі пытанні пра тэрыторыю рэспублікі, структуру і склад яе ўрада, падрыхтоўку праекта Маніфеста пра абвяшчэнне БССР. 29 снежня прадстаўнікі беларускіх секцый пры ЦК РКП(б) З. Жылуновіч, А. Чарвякоў і іншыя выехалі з Масквы ў Смаленск для ўдзелу ў VI Паўночна-Заходняй абласной канфэрэнцыі РКП(б). Канферэнцыя пачала сваю работу 30 снежня. З дакладам выступіў А. Мяснікоў. Ён на падставе рашэнняў ЦК РКП(б) абгрунтаваў неабходнасць абвясціць ССРБ. На гэтай жа канфэрэнцыі была прынята пастанова, у якой гаварылася, што: «VI абласная канфэрэнцыя бальшавікоў лічыць неабходным абвясціць самастойную Сацыялістычную Рэспубліку Беларусь». А. Мяснікоў выказаў прапанову аб пераіменаванні VI Паўночна-Заходняй канферэнцыі ў I з'езд Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі, якая была прынята дэлегатамі. КПБ(б) абвяшчалася складовай і неад'емнай часткай РКП(б). З'езд выбраў кіруючы орган КП(б)Б - Цэнтральнае бюро. 31 снежня адбылося яго першае пасяджэнне. Быў абраны прэзідыум ЦК КП(б)Б у складзе А. Мяснікова, М. Калмановіча и В. Кнорына. Старшынёй прэзідыума быў абраны А. Мяснікоў, сакратаром - В. Кнорын. 31 снежня 1918 г. ЦБ КП(б)Б абмеркавала пытанне пра тэрыторыю БССР, склад Часовага рабоча-сялянскага ўрада БССР і абвяшчэнне Маніфеста пра ўтварэнне БССР. 1 студзеня 1919 г. Маніфест быў абнародаваны. Такім чынам, быў пакладзены пачатак рэальнай нацыянальнай беларускай дзяржаўнасці.

### *Спіс літаратуры*

1. Утварэнне БССР [Электронный ресурс]. - Режим доступа: https://betarask.wikipedia.org/wiki/
2. Гісторыя Беларусі: у 6 т. - Мінск: Экаперспектыва, 2007. - Т.5. Беларусь у 1917 -1945 гг. /А. Вабішчэвіч [ і інш. ]. - 613 с.

*Дрозд Мікіта Сяргеевіч*, студэнт 1 курса факультэта інфармацыйных тэхналогій і кіравання Беларускага дзяржайнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі, nikitadrozd2001@gmail.com.
*Навуковы кіраўнік: Мікалаева Людміла Віктараўна*, загадчык кафедры гуманітарных дысцыплін Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, Mikalayeva@bsuir.by.